ДЗЯННІЦА

Вестка Беларускага Нацыянальнага Камісарыяту.

Асобны №. каштуя усюды 35 кап.

№ 29

ГАЗЭТА КАШТУЯ:

	На 12 мес.	На 9 мес.	На 6 мес.	На 4 мес.	На 3 мес.	На 2 мес.	На 1 мес.
У Расеі	15р.—к.	11р.50к.	8р.—к.	5р.20к.	3р.90к.	2р.60к.	1р.30к.
За граніцу	20р.—к.	18р.—к.	12р.—к.	8р.70к.	6р.—к.	4р.—к.	3р.—к.

Калі выпісваяцца разам некульні №№, та робіцца уступка на 20%.

Перамена адрысу каштуя 50 кап.
Радакцыя і Адміністрацыя: Масква, Паварская, 52.

Масква, 1918 г. 10 Сенцябра. Выходзіць ня меньш чатырох разоу у месяц. І-й год выданьня.

Канцылярыя Беларускага Нацыянальнага Камісарыяту адчыняна што дня, апроч сьвят, ад 10 г. да 4 гадзіны дню.

Масква, 10 секцябра.

Французская і ангельская буржуазея і грашаунікі шмат сабралі у сабе крыуды на расейскі працоуны народ і за тоя, што іон пакрыудзіу і у сябе дома уласную буржуазею і багачоу, і за тоя, што кінуу вясці вайну за яе інтарэсы, а разам і за іх інтарэсы і, найболяй за тоя, што адказауся плаціць ей зробляную царом пазычку. Каля 20 мільярдау грошай, хоць сабраных потам і крывіою рабочых і селян усе такі ля іх ня абы што, і на табе—прапалі дарам, ня прынеслі жаданае карысці! Ціж то ня крыуда? Вось злажыушы усе разам, яны, гэты чужаземныя шулятнікі і ваукалакі, дзе падгаворамі, а дзе подкупамі, пачалі спагадаць сваю злосць на сваіом даужніку, расейскум працоунум народзя.

А каб бяз гоману і гладчэй усе зрабіць, імі стала пускацца у ход хітрая смікалка: перш усяго імі было падкупляна знаходзючая у Расеі чэхаславацкая і сэрбская войска ля паустання супроць радавае уласці, а калі гэтаго стала мала, дык ім на падмогу яны паслалі і свае войска, французская і ангельская, з якім і стал патроху забіраць гарады і вешаць бальшавікоу. Робячы ж гэта, спагадныя хаурусьнікі стараліся усякімі абецанкамі і завабамі падлагодзіцца да расейскаго працоунаго народу, каб адурманіць яго, ашукаць і моучкі далей і далей пралазіць у Расею і касаваць заваевы Равалюцыі. Яны разлічвалі, што усе гэта ім удасца і мэта іх будзя дасягнута. Але зусім іначай вышла. Працоуны народ зразу скеміу, што парадкі, зробляныя ім праз равалюцыю ня даюць спаць усясьветнуй буржуазеі і яна пражэцца праз вайну іх згубіць! Вось і стау іон замест послуху гатовіцца да адпору, так сама ня абвешчаючы вайны ні французскаму, ні ангельскаму працоунаму народу. Надоячы, аднак, „хаурусьнікі“ знялі туль з сваіх тварау і голасна абвясцілі праз свае газэты, што яны адчынілі супроць Расеі вайну. Дык вось да чаго вялі іх усе хітрыкі і начым трымауся хаурус! Пануючым станам грашаунікоу і памешчыкау трэ быу іон ля таго, каб зводзіць да ня сканчэннай вайны працоуны народ, праз якую ім даставалася нязмерная багацьця. Каліж расейскі працоуны народ адказауся ім служыць дык яны пашлі сілаю заставуляць яго... Не! Гэтаго ім няудасца! Расейскія селяня і работнікі знойдуць сілы даць ім, гэтым зарвалым „хаурусьнікам-палашам“ належны адпор і паказаць ім іх належная мейсца! Вайна будзя, але ня тая, што ім хочацца! Вайна працоунаго народу з буржуазеяй усяго сьвету! З гэстаго боку „хаурусьнікі“ дасягнуць свае мэты, хоць яна стрэняцца з імі ля... іх магілы.

Контар-равалюцыйны тэррор.

У тыя часы, як увесь расейскі пралятарыят і равалюцыйнае селянство, адцураушыся ад усяго прыхільнасці да усясьветнае бойкі і працягнуушы братоуную руку замірэньня к усім народам, знайходзіцца у вахкум палажэньні перад падкімі ратамі чудзішчау імпэрыялізма, якія прагуцца праглынуць ліохкую, як ім здаецца нажыву, нашы уласныя грашаунікі і іх найміты шчыра ім у гэтум пасабляюць і знайходзяцца у цеснум стасунку з імі. Ня маючы сілы справіцца з нянавісцаю дзеля іх уласцю працоунікау і селян, яны кідаюцца да іназемных грашаунікоу, шукаючы там падмогі і ня толькі падмогі, але і кіраваньня у наступу супроць Радаваго ураду. Сабе ж яны бяруць чорную працу выпауненьня прыказу англіцкіх, працускіх ці нямецкіх кіраунікоу. С аднаго гэтаго зніштажэньня акцябэрскае равалюцыі яны прыляпіліся да двух роэйных змагаючыхся бакоу—Гэрмані і Англі і падзялілі Расею на дзве долі: заходнюю, дзе укладаюць „парадак“ поруч з немцамі, і усходнюю, дзе чэха-славакамі, гапонцамі, англічанамі і францусамі прагуцца абурыць радавы устрой. Разбору німашака: хоць с кім, альбы ня с камуністамі.

Да гэтаго паходу супроць пралятарыяту і селянства далучыліся усе тыя, хто ня дбая аб заахоўя атрыманых працоунікамі прау, тыя, хто ня можа згадзіцца, „што ціомны, нявучоны народ кіруя гасударствам“. На гэтуй думцы сышліся і прыхільнікі манархізма, які можа забеспечыць іх аканамічнае і палітычнае валадарства, і абаронцы дэмакратычнай распублікі, дзе кіраваньня будзя належыць да інтэллігэнтау і буржуазеі. Маючы агульныя мэты с іназемнымі грашаунікамі яны цесным кругам абнялі Радавую Расею, трымаючыся на занятых мейсцох ня па волі народа, а на штыкох сваіх хаурусьнікау. Але іх ня здавольвая валадарства на ускраінах, іх бярэ зойздрасць, што цэнтр Расеі ня у іх руках, што у сэрцы яе яшчэ кіпіць равалюцыйная кроу, што там куецца воля і дух дзеля далейшае спрэчкі і барацьбы з імі, што там знайходзіцца смелая рука, якая вядзе за сабою увесь пралятарыят да змацаваньня ня толькі сваіх контр-равалюцыянэрау, але і усясьветных грабіцеляу і прыгоншчыкау.

Вось і мысляць чорныя вароны: калі вырваць гэтае жывое сэрца, адсеч кіруючую руку, та усіо цела Радавае Расеі замрэ, і тады можна будзя кляваць і рваць яго і рабіць з ім, што хочаш. Але дастаць гэтае сэрца адкрыта нельга, бо цела моцнае і зможа адбіць працягнутую падкую руку. Трэба было шукаць іншы спосаб, і яго знайшлі. Ціха, з-за вугла крадзецца нехта чорны і запуская у сэрца нож. Так згінуу некулькі часу таму назад Валадарскі, так згіблі Усіевіч і Урыцкі, так падымалася чорная рука на Зіноуева, так кранулася яна супроць Леніна, які прымушаны ляжаць у пасцелі ад дзвіох ранау, нанесяных падосланымі убіуцамі. Мусі-быць, мэтаю тае чорнае арганізацыі, якая кіруя гэтымі убіуствамі, з'яуляяцца зніштажэньне усіх тых адказных асобау, якія стаяць у галаве Радаваго устрою. Гэтым яны мысляць атабраць у пралятарыята іх павадыроу, лішыць равалюцыю яе сэрца і розуму, зніштожыушы асобных лепшых працоунікау яе.

Такі рахунак, калі іон іосць, ня прывядзе да жаданаго канца. Дух равалюцыі, яе ідэалы, атрыманыя правы пралятырыятам і селянствам шырока уніклі у разуменьне народу і зладзейскім убіуствам нельга перавернуць волю народа, нельга прымусіць яго адцурацца ад таго, што яму патрэбна як воздух, як вада. Працоуны народ добра ведая, што прыпыніся іон хоць крыху у дамаганьні к абароня сваіх правоу, прыдзі у малейшы смутак нават і ад вялікае патраты праз гібяль таго ці іншаго павадыра равалюцыі, як гэта скарыстаюць яго ворагі і ня будуць чакаць, каб скаваць ізноу яму рукі. Дзеля гэтаго, хоць і важка сьмерць легшых равалюцыянерау ад рукі зладзеяу, усіо-ж яна ня прыводзіць да нэндзы, адчаяньня, а наадварот дае большыя сілы дзеля рахункавае спрэчкі.

Тая неунасць і сьвядомасць сваіх сілау, якія знайходзяць свой пачатак у веры адоляньня ворагау, знайшлі выяуленьне у тым супакою і самаустрыманьні, якімі сустрэу пралятарыят Масквы і іншых гарадоу вестку аб зрадзя на таварыша Леніна. У гэтым самаустрыманьні праглядая рашымасць вясці барацьбу да канца, ня даючыся часовай хвалі, якая наляцела з пауночнаго боку; вясці яе арганізована, згуртавашыся яшчэ цясней вакол сваіх равалюцыйных устаноу і асаблівых дзеячау. І чымся горшым будзя напад ворагау, тым рашыцельнай будзя барацьба, якую павядзе з імі працоуны народ.

Ужо самы спосаб змаганьня, да якога схілніліся контар-равалюцыянэры, спосаб пэрсанальнаго тэррору, паказвая, што у іх німашака іншаго выхаду, німа сілау. Гэты тэррор з'яуляяцца астатняю картаю, на якой яны спадзяваюцца выйграць. Але і гэтая карта будзя пабіта, як і усе першыя, і рахунак за ігру будзя цяжкім дзеля іх.

А. В.

Чуткі.

Чуткі дзіуныя і знарочыстыя, як чорныя вароны лятаюць па абшары Расеі і за яе межамі. Кожны дзень кожны з нас чуя інакшыя, боляй дзіуныя з іх, кожны дзень іх родзіцца як смецця. Яны ня абмінаюць нікога нідзе, самі лезуць у вушы, міжвольна напіхаюць імі няпрошаныя людзі, смела падхозючыя да нас і тут жа баутаючыя іх. Мы слухаям і зрэдку толькі сплюоуваям, лічучы іх плиоткамі, боляй жа астауляям у памяці.

Ціж гэта гадзіцца? Ціж добра мы робім? Слухаючы—та яшчэ мала грэшым, але пераказваючы другім—няпрашчона. Чаму? А таму, што мы патураям гэтым ікрас тым чорным паскудным злыдням, якія толькі і займаюцца тым, што чыняць гэты чуткі. Прычуйцяся і зраунеця іх адна з другою і ясна вам адмеціцца, што кожная чутка мая адну мэту: падгатовіць ціомных людзей да тых здарэньняу, якія апісваюцца у гэтых чутках. А апісваяцца у іх боляй усяго

аб тым, што там та і там та забіты той ці іншы камісар, што варагі працоунаго народу занялі той ці іншы горад, атабраушы яго ад бальшавікоу, што немцы скора забяруць Маскву, што Радавая уласць уцячэ на дніох кудысці. Як бачыця, што чуткі аднакія. Вось знайця, што і пускаюць іх толькі варагі цяперашняго парадку, усялякія чорнасотнікі, буржуі ды белагвардзейцы. Яны гэтым стараюцца запужаць людзей, увясці сумяціцу, чым і скарыстаць. Яны ведаюць, што гэтакі способ барацьбы ня малавыгадны у цяперашні час, калі яшчэ большасць народу няграматнаго і чытаць ня умея, ды і няусюды прахадзяць газэты. Ды ведаюць так сама, што ніякімі карамі ня праняць іх, бо трудна улавіць таго, хто першы злажыць і пусціць чутку. Дык ня верця усякім чуткам!

Мэта варта способу.

Англіцкія і французскія імпэрыялісты ніяк ня могуць падаравацъ расейскаму работніча-селянскаму ураду тое, што Расея вышла з усясьветнае вайны, якая усіо яшчэ цягняцця па жаданьні і хэнці грашаунікоу.

Ня могуць яны падаравацъ праз тое, што, па-першыні ім прышлося адным вясці вайну і у Расеі яны лішыліся таго „пушачнаго мяса", аб якім казау лорд Асквіт яшчэ у 1915 годзя: „Мы (англічаня) будзям вясці барацьбу да апошняго расейскаго салдата". А цяпер гэтыя салдаты разышліся па сваім хатам падараваушы права быць гарматным мясам самым англічанам.

Як жа тут вытрываць? Трэба умяшацца, зратаваць Расею ад захапляньня немцамі, ізноу прымусіць яе ваяваць, а то ім сваімі сіламі ня адоляць немца. Другое, Расейскі урад зьніштожыу усе пазычкі, як унутраныя, так сама і іназемныя. Апошнія, зробленыя калішнімі урадамі, натта вялікія, і англійскім і францускім грашаунікам натта шкода развітацца са сваімі грашмі. Трэба абурыць Радавы урад, бо з зніштаженьням яго будуць вазстаноуляны і усе пазычкі і даугі. Трэцьцяе, хаурусным гандліоушчыкам натта ня па сэрцу, што яны выпусцілі з рук, такі вялікі рынак, як Расея, куды яны рахавалі вывозіць свае тавары.

Вось гэтыя глаунейшыя прычыны і падбухторваюць хаурусных імпэрыялістау вясці барацьбу супроць расейскаго пралятарыяту і равалюцыі. С пачатку гэтая барацьба заключалася у полаху умяшацяльства, але яна ня прывяла да жаданаго канца. Полаху ніхто ня збаяуся, і расейскі урад віоу сваю працу у замацаваньні заваіоу равалюцыі. Тады хаурусьнікі парашылі кінуць на Расею вайскавую сілу. Але дзе яе было узяць. У саміх—ня хапая, ды і даліока ім да Расеі. Трэба было знайсці сабе падсобнікау і прыхільнікау у Расеі, ды яшчэ скарыстаць сьвежыя гапонскія сілы. У Расеі знайшліся прыхільнікі сярод манархістау, кадэтау, правых эс-эрау і у астатку чэшска-славацкіх палкоу. Гэтыя розных масцей елементы злучыліся пад адным сцягам зляжэньня Радаваго устрою і пачалі захапляньне уральскіх, паволжскіх і заходна-сібірскіх вобласціоу, а с усходу на падмогу ім ідуць гапонцы.

Самы англічаня і французы прывязлі свае войскі у Белае мора і высадзілі іх на Мурманскум пабярэжжы. Карыстаючыся далячыніою гэтаго краю ад цэнтру і пусташшу мейсца, яны скора захапілі Архангельск і някаторыя драбнейшыя гарады і мястэчкі. У гэты самы час іх халопы, кратаючыся па Волзя, захапілі Самару і Казань. Агульны іх плян ахапіць Радавую Расею з усходу паукругам, каб, калі ня удасца дамагчыся свайго ваеннаго пляну сілаю, дык узяць зморам, ня прапускаючы у Цэнтровую Расею харчавых рэчай з Сібіру і багатаго Паволжа.

Някаторую удачу у вышауненьні гэтаго пляну яны мелі, але да тых часау, покуль Радавая уласьць мніла уладзіць размову па-ласцы. У апошнія ж часы, як стала ясна відаць, што хаурусьнікі і контар-равалюцыянеры пасягаюць на самую равалюцыю, былі прыняты меры дзеля хутчэйшаго адоляньня варагау працоунаго народу. Радавыя вайскі павялі наступ на усіх фронтах і пачалі адбіваць адно мейсцо за другім. Надзея на адоляньня равалюцыйнаго люду у адкрытым полі „у чеснай бойцы", як казалі калісь—то маскоускія ваякі, гэтая надзея пачала абурвацца. Праз гэта была выбрана іншая дарога—дарога патаемнаго перавароту.

31 аугуста у Пецярбургу заарыштованы англіцкі прадстаунік Локкарт, французскі гэнеральны консул Грэнар, гэнерал Лявэрн і шмат іншых англіцкіх і францускіх ахвіцэрау. Як быу зняты дапрос, прадстаунікі Англі і Францы, як нізачэпныя асобы былі аслабаняны. З разследаваньня відаць, што англіцкая місія у Пецярбургу стаяла у галаве загавору супроць Радаваго ураду і мела у мэця скінуць апошні, заарыштаваушы Савет Народных Камісарау, і асабліва павадыроу пралятарыяту т. т. Леніна і Троцкаго. Дзеля гэтаго некі Лейтэнант Рейлі увайшоу у зносіны з начальнікам аднае Радавае вайскавое часці, якую треба было падкупіць, каб яна, будучы на варця пры пасядзэньні Савета Народных Камісарау ня рабіла перашкод тым, хто явіуся б арыштаваць яго, або і сама зрабіла б гэты арышт. Дзеля подкупу было дано шмат грошай. Падкупляуся ня толькі начальнік і яго вайскавая часць, але і шмат сапрацоунікау розных Радавых устаноу, якія перадавалі розныя сакрэтныя весткі аб палажэньні на фронтах і ліку радавых вайскоу. Апрыч гэтаго, па усей Расеі былі раскінуты саглядатаі-шпіоны, якія маючы дыпламатычныя засьвятчэньня нізачэпнасці вольна езьдзілі усюды і рабілі сваю паскудную працу.

Каб пасля перавароту, які меркавалі яны зрабіць каля 9—10 сенцябра нов. сціл., прымусіць народ кранущца ізноу на вайну з Гэрманіяй, зрадчыкамі пастаноулена было выдаць іншую, хвальшывую згоду аб замірэньні (у Брэсці), дзе б варункі замірэньня былі б страшэннымі і зусім няпрыемнымі дзеля Расеі. Такім способам рахавалася падняць у расейскаго народу злосць да Гэрманіі і пхнуць яго ізноу у крывавы туман вайны дзеля заваіоу выгад англіцкіх і францускіх грашаунікоу і банкірау.

Гэтая раскрытая зрада цяпер лішні раз паказвая працоунаму народу Расеі, хто хавауся пад прозвішчам „хаурусьнікау" і на якія толькі способы гэтыя „абаронцы" Расеі ні кінуцца, ліш бы злавіць сабе у кішэню загубляныя мільіоны, ліш бы мець магчымасць і далей цягнуць з працоунаго народу жылы, накарыушы яго пад сваю уладу. Ні перад адкрытаю барацьбою на Мурмане, ні у пасобнічасцвя чэха-славакам і расейскім белагвардзейцам, ні перад сярэдня-вековаю зрадаю і ударам нажом у спіну у ціомнум пераулку яны ня прыпыняцца. Здавалася, увесь сьвет асудзіу і пахаяу езуіцкі лозунг: мэта варта способу, але сучасныя высока - культурныя брытты ня гадзяцца скарыстацца гэтым ліозунгам з вякоу цемры і прыгону у сваіх слепападкіх дамаганьнях.

Няудачная зрада кіраунічых хаурусьнаю палітыкаю у Расеі пакажа і англіцкаму і францускаму пралятарыяту, на якія паступкі можа пайсці абязумеушая імпэрыялістская палітыка. Ні адзін чэсны чалавек ня зможа згадзіцца з гэтымі паступкамі, ня зможа дазволіць, каб ахвіцыяльны прадстаунік гасударства брау у рукі нож і крауся, як злодзяй, к прыкмечанай жэрцвя, якою з'яуляуся б расейскі працоуны народ і зробляная ім равалюцыя. Англіцкія і французскія працоунікі асудзяць свой урад за гэта і голасна патребуюць прыпыніць насілаваньня і усякую пагрозу равалюцыйнай волі расейскаго працоуніка і селяніна.

Ясік.

Правальваяцца зямля.

Нас павядамляюць, што парада далягатау на усеукраінскі з'езд беларусаубежанцау выказалася за фэдэрацыю Беларусі з Расеяй. Гэтым напесян яшчэ адзін штырх няпачэснуй палітыцэ гэрманафільскіх колау беларускае рады.

Доугі час трубілі іх газэты аб тым, што справа, якую вядзе Беларускі Камісарыят у Расеі на конт пашырэньня сярод беларусау думкі аб патрэбя злучэньня Беларусі з Расеяй—пустая рэч, бо яна ня прыносіць сабою ніякіх пліонау—ні беларусы на Украіня, ні беларусы у забрануй часцы Беларускаго краю, ня пойдуць за „бальшавіцкімі русьсьфікатарамі". Гэты свае думкі паугэрманскія незалежнікі ахвотна і рада падмацоувалі прыкладамі [illegible], якія выказваліся тым ці іншым навернутым к якім-кольвек наубуржуям-кулакам Сакратарыяту, ці звертам на свой бок аднаго ці другога „чалавека". Трэба было чаму спадобнаму трапіцца, як з іх вуст вырывауся крык: „Ага, справа расце! Да працы Рады прыслухоуваюцца жыхары! Мэта незалежнасці бліжыцца хуткім крокам".

Вядома, гэта магло радуваць іх, бо на галя пустыры усякая зялёнка-дрэва. Сапрауды ж, радасці іх ня было яды ля узросту, што бачылася вакол ясна.

Мэта незалежнасці—рэч зусім ціомная ля беларускаго працоунаго народу і іон да яе у вагуля адносіцца недбайна,—калі ня воражна. Зрэдку знайходзіцца адзін ці другі, боляй-меняй інталігэнтны выхадзец з народу, які падзяляя гэтыя думкі... Але з проста незалежнасцю—мо сяк—так людзі і мірыліся-п і, бадай, Рада магла б пасьпешняй працаваць. Нямецкая падкраска, якую радцы пачалі ужываць с пачатку, у канец згубіла іх і адхіліла беларускі народ ад іх. Дзеля нас гэта ня сакрэт, і мы весь час мелі за сабою у падмацунку жыцявоя з'явішча. Паміж іншым, склікаяы у Маскве усерасейскі з'езд бежанцау-беларусау, а цяпер і дэлегаты усеукраінскаго з'езду—яскравыя прыклады. Усе надзеі у Рады і могуць апірацца толькі на тыя маленькія гурткі шляхецка-польскай буржуазеі з нізу і на бойных паноу з верху. Гэтак яно дасюль і вядзецца і, відаць, што гэта „дэмакратау-незалежнікау" зусім ня здавольвая. Ня дзіва таму, што іх прагныя погляды былі зверпуты на бежанцау на Украіня, дзе варункі ікрас аздатны ля іх працы. Ля падгатоукі з'езду працавалі заложаныя па гарадох Украіны безтварыя беларускія гурткі, з добрай прыкрасай чорнасотнікау, але нічога ня выйшла. Працоуны народ, калі і ціомны шчэ, дык міжвольна ачувая, дзе і хто яго прыяцель ды жадая яму дабра. Расейскі народ, ужыушы вялікія свабоды і праводзючы мэты народауластва—ціж рауня гэрманскаму грашаунітву? І цяга да усходу ня зміряя у гушчы беларускаго працоунаго народу; ня зміряя зусім ня таму, што яго нацыянальная пачуцьціо ня адзначаяцца. Зусім не! Наадварот, чым боляй іон прычашчаяцца да нацыянальнаго асьвядамленьня, тым ясней і патрэбнай перад сабою мулюя усю выгаднасць фэдэрацыі з Расеяй, як скончаны звітак свайго гасударскаго самабудаваньня. Няужо гэта няведама радцам? О, ведама і добра нават але што ім да голасу народу, калі яго перамагая голас буржуазеі. Яны ахвяравалі служыць ёй датуль, пакуль зямля правалiцца пад імі ня толькі з боку. А гэта ужо ньу-бавае.

Шчыры Беларус.

ЦЯЛЯГРАМЫ.

Таварышу ЛЕНІНУ.

Страшэнна узбураны трапункам паганаго нападу на Вас, шаноуны таварышу Уладзімяр Галіяшау, як на павадыра працоунаго народу і яго шчыраго абаронцы, радакцыя беларускай газэты „Дзянніца" жадая Вам скора ачуняць, заняць свае мейста і з новаю сілаю і пэнтам вясці далейшую барацьбу за правы працоунаго народу і за ахову вялікіх заваеу равалюцыі. У свой чарод радакцыя верыць, што гэты способ барацьбы з боку цемных сілау і варагоу працоунаго народу—есцяка апошні сударгны іх уздрых, пошля якога іх чакая смерць.

Радакцыя „Дзянніцы".

Таварышу ЛЕНІНУ.

Беларусскі Нацыянальны Камісарыят шле таварышу Леніну свае шанаваньне выказвая сваю жорсткую злосць супроць тых, хто, патаемна падсылае убіуцау на павадыроу працоунаго люду, мяркуючы абурыць праз гэта усе заваевы сацыяльнай равалюцыі.

Беларускі Камісарыят трымая надзею, што Вы хутка ачуняяцца будзяця працаваць як да гэтых часоу на карысць працоуных людзей усх зямель нацыяу.

Белнаком.

З цыклю „Зоу Будзячы".

(Ахвяруюю Е. С. Канчэру).

VI.

Бунт.

Люб мне ветру гуд шаліоны
Калі хіліцца да долу
Пад ім дубава карона,
І стагнець зямля наукола.
У нястрыманум пэнту мкнецца
Слупам пыльным завіруха
І усе нішчыцца ды б'ецца
Пад надавам яе руху.
Ні заставы, ні прыпоны
Няймюць сілы пазмагацца,
Спыніць ветрау хваляу узгоны
І зруйненьню ня паддацца.
Люб мне ветру посьпеу люты
Песьні вольнай вызваленьня,
Калі сцішы мяртвай путы
Усе губляя з аблягчэньням;
І пачуушы рэзвасць руху
З ветрам носіцца гуляя
Ды бурлячым вечным духам
Мяртвым жыцця укладая.

VII.

Прозьбы.

Ня пакінь мяне надзея
У чорную часіну,
Што я угледзяць шчэ сумею
Вольнаю краіну;
Што у народзя хопіць сілы,
Хопіць цьвіордай мочы,
Пераджыць ціпу магілы
І цемь дзікай ночы.
Згартаваны цяшкай доляй,
Мук ліхіх ды жалю,
Не загубіць вольнай волі
Ён сьвятых скрыжаляу.

Не-растанься з душой вера
У час, калі трывога
З'явішч чорных прэ няумеру
З краю дарагога.
Пад цалунам цяжкіх хмарау
Звіслых над зямліою,

АД РАДАКЦЫІ.

Рукапісы, якія прысылаюцца ля друку, павінны быць чытальна напісаны на адным боку паперы.

Няпрынятыя рукапісы звяртаюцца аутарам, калі ля перасылкі будзя прыслана марка. Малыя рукапісы ня варочаюцца зусім.

РАДАКТАР ПРЫМАЯ ад 11 да 4 г.

Радакцыя і Адміністрацыя: Масква, Паварская, 52, тал. 1-51-63·

Дай мне бачыць мулі чарау
Сонца прад зарою.
У прыгоня, у нязгодзя,
У іх балючай раня,
Малюй думкі аб свабодзя,
За яе вітаньня.

Светласць веры, рыж надзеі,
Дзей жывых кароны —
З вамі усе злыгапа!
Разабецця цемь тумана
І хай сонца зіхацея
Панад вамі нясціханна
Светласцю чырвонай!

Цішка Гартны.

Деятельность Белорусскаго отдела Комиссаріата по національным делам Союза Северных Комунн.

О деятельности Культурно-Просветительного Подотдела.

Составлены сметы и к ним подробныя об'яснителчныя записки:

1) На организацию Белорусского Народного Университета.

2) Белорусской гимназии.

3) Педагогических курсов для народных учителей.

4) На издание белорусских учебников, учебных пособий и литературы.

5) На устройство белорусской библиотеки и при ней читальни.

Все перечисленныя сметы отправлены по принадлежности.

Составлено и разослано до 20-ти экземпляров в Правительственныя учреждения и некоторыя редакции газет подробное воззвание о необходимости перенесения Юрьевского Университета в один из городов Белоруссии.

Затребованы сведения в комитете о беженцах и в архиве Комиссариата Народного Просвещения о всех эвакуированных из Белоруссии учебных и образовательных учреждений.

Составлена и послана в Национальный Комиссариат программа работ в Петрограде.

Составлена записка о задачах и цели учреждения Культурно-Просветительного Подотдела.

Заведывающим Подотделом сделано несколько личных докладов и ходатайств в Комиссариате Народнаго Просвещения как то: об отпуске 15 тысяч руолей на открытие учительских курсов, об отпуске девяносто двух тысяч рублей на учреждение Белорусской Гимназии, о снабжении Подотдела справочными изданиями. Заведываощим Подотделом сделаны личные доклады и ходатайства у Комиссара Имущества Республики: о народном доме, о гимназии, о народном театре и клубе.

По предложению Комиссара Имущества Республики из согласия Белорусского Отдела осмотрены следующия здания: в районе быв. ипподрома, на Басейной ул. 12, на Гагаринской ул. 6, на Конюшенной ул. 2. Цель осмотра: действительно ли пригодны осматриваемыя здания для предположеннаго помещения в них культурно-просветительных учреждений.

Заведывающий принимал участие во всех заседаниях Коллегии Белорусского Отдела, а также в еженедельных конференциях всех заведывающих Культурно-Просветительными Подотделами и в других собраниях представителей научной белорусской интеллигенции, входящих в состав «Общества для изучения Белоруссии».

Кроме того, заведывающим Культурно-Просветительным Подотделом было сделано подробное словесное сообщение о задачах подотдела с кратким очерком переживаемаго теперь Белоруссией момента в публичном собрании белоруссов—рабочих Путиловскаго завода состоявшемся 28-то сего Июля.

О деятельности Агитационно-Издательского подотдела.

Деятельность Подотдела в разсматриваемый промежуток времени выразилась в следующем:

1) **В области агитации:** а) по инициативе Подотдела были созваны митинги в Петрограде и в Кронштате, на которых представители Белорусскаго Отдела отстаивали мысль о необходимости самого теснейшаго единения трудящихся белорусских масс с трудящимися массами остальной Советской России освещали ту позорную работу, которая проводится немцами в занятой части Белоруссии и призывали своих сограждан стойко защищать родину и Советскую власть. Во всех этих случаях были вынесены резолюции в духе коммунизма и на платформе Советской власти.

2) **В области издательства:** приступлено к изданию двухнедельнаго журнала «Чырвоны Шлях» (Красный путь), в котором помещаются статьи, как на белорусском, так равно и на русском языках, детально разбирающия вопрос о современном политико-экономическом положении Белоруссии, о ходе ея общественной жизни, о положении ея в пределах германской оккупации, о зарубежной «власти». Пока выпущены №№ 1 и 2 и для ознакомления разосланы во все уездные Совдепы незанятой части Белоруссии, во все белорусские организации, школы, кооперативы и союзы служащих.

За недостатком средств и людей. Подотделу пришлось во многом отказаться от своих первоначальных намерений. Но несомненно, что в будущем с увеличением средств и новаго кадра работников работа отдела пойдет интенсивнее и продуктивнее.

Обзор деятельности политическаго--подотдела:

Общая цифра белорусских граждан, живущих ныне на всей территории Северной области, как ввиде постоянных белорусских колоний, так и ввиде временно разселившейся в разных пунктах области белорусской беженской массы, превышает цифру свыше полумилліона человек. Заботы о национальных нуждах этих белорусских масс в замедлении возложены на Политическо - Правовой Отдел в лице его регистрационнаго, Ликвидационно-Беженского и Административно-Кодификационного Отделений. Подотдел ведает политико-правовыми, административными, беженско-ликвидационными и отчасти кодификационными вопросами. Главная часть работ этого Подотдела заключается в регистрации всей белорусской беженской массы, разселившейся на всем пространстве территории Северной области и в последнее время стихийно устремившейся в Подотдел в целях регистрации и получения соответствующих удостоверений на предмет безпрепятственного в'езда к себе на родину, в Белоруссию. Первые шаги в деятельности Подотдела в этом направлении были всецело направлены к урегулированию белорусского беженского движения, к введению его в русло планомерной и организованной реэвакуации, но таковыя условия в значительной степени не привели к желательным результатам, так как Подотдел был лишен каких бы то ни было операционных средств, да и весь беженский вопрос в целом еще до сих пор далеко не урегулирован. До настоящаго момента, т.-е. с начала возникновения Политическо-Правового Подотдела зарегистрировано свыше 5.000 глав семейств, что при среднем расчете 4 человека на семью дает в общем 20.000 белоруссов беженцев, уже зарегистрированных и имеющихся уже на учете у Подотдела. Накапливающийся в Подотделе регистрационный материал систематизируется Регистрационным Отделением Подотдела и им же ведутся подготовительныя работы по распределению заре-

Капыль у Равалюцыі.

VII.

Тоя, што сацыялісты дахітрыліся закінуць семя свае работы і у салдацкую сем'ю, што гэта сем'я папала ікрас у добрую глебу і гатовіцца прынясці багаты плен,—скора стала ведама капыльскаму начальству. Троха па чуткам, троха з даносау, чутку па дагаткам, і яно намалявала сабе поуны абраз, між іх волі падхварбованы шчэ спужаным вечна уражэньням у цемную мулю, мусячых стацца скуткау ат падбухторваньня салдат, і хуччэй жа узялося старацца, каб «пянадзейную» роту замянілі другімі салдатам.

Просьба аб гэтым ня заставіла сябе доуга чакаць. У адзін пекны дзень праз таварыша Крукава даведаліся арганізацыі, што іх рота напагатовя к астауленьню Капыля. Трэба было ня астацца бяз ведома адны ат другіх і т. Крукау запісау некулькі адрасоу, на якія абяцау прысылаць лісты. Ен так сама кляуся, што калі дзе будуць прымушаць іх іці супроць рабочых ці селян, та іх рота пізашто ня пойдзя. Капыляня прасілі пягнуць даляй работу па адукацыі салдат, рабіць звязак с другімі часцямі і шырыць народную справу як мага.

Тым часам ужо хадзілі чуткі аб блізкум замірэньню і чууся яскрава бурлячы уздым хваляу равалюцыйнаго руху. Было ведама, што разбухторапую у сацыялісткум духу роту на фронт ня паголяць, а дачасна, покуль прыдзя пара адпуску мабілізованых, іх спыняць дзе кольвячы у горадзе. З-за гэтаго настрой салдат быу ня хмуры. Усіоткі, па тым развітаньню, якоя мела мейста паміж капыльскаю сацыялісткаю моладзю і салдатамі было шчырая да сэрца. Шмат было нават і пацалункау, ня толькі братэрскіх поціскау рук.

VIII.

Прыход новай роты салдат ня заставіу сябе доуга чакаць. Праз дзіон пяць-шэсць ужо яны былі у Капылі і няслі варту па мястэчку. Аднак гэта зусім на смуціла таварышау і ня адбілася на арганізацыйнай і агитацыйнай працы. Гопыт пражытых дніоу і палажэньня у Расеі настройвалі зусім не па смутак і прыгнет духоуны. К гэтаму трэба дадаць, што другая рота, на бяду начальству капыльскаму, патдалася равалюцыйнаму падбухторваньню куды лягчэй, ніж першая. Маладыя салдаты былі падатлівы, а старэйшыя ні аб чым ня дбалі, як толькі аб дому, ды скарэйшум роспуску да хаты. Прыходзячыя з газэтамі весткі з Расеі бадзіорылі капылян і паводзілі на рады, чакаючы настрой. Чууся блізкі прыход чагось знатнаго і велікаго. Кожны дзень ля пошты збіралася група моладзі і пажылых людзей, да якіх прыходзілі салдаты і, чакаючы газэт, рабілі мітынгі, гаворучы аб усім вольна. Дастатыя ж газэты чыталіся у чуткі і іх слухалі з вялікім цікам. Паліцыя усіо гэта бачыла, але толькі скоса пазірала, бо нічога зрабіць ня магла: чуючы свае бязсільля, яна нават і няпрабавала гэтаго рабіць. Гэта было ведама арганізацыям, і яны стараліся выкарыстаць і яе бязсільля, і час. Вось ня было таго дню, каб моладзь ня збіралася на аднэй з вуліц, Нясвіжскуй, якую празвалі „Рабочаю біржаю". Сотні партыйных людзей сходзілася па біржу, дзе адчыняпа вяліся дыскусыі паміж сацыялістамі-равалюцанэрамі, і сацыял-дамакратамі, паміж сіяністамі і бундауцамі, паміж рабочымі і інталігэнцыяю. Палітычная жыцьцio кіпела нібы у вялікум цэнтру, дзе шмат і людзей сабрана, і адкуль даецца кірунак усей працы. Зусім ня дарэмна кажу! «Па пэнту і значнасці равалюцыйнаго руху, па вахкасці ппіопу яго і па карысці, якую ен прыніос расейскай равалюцыі—м-ка Капыль ня можа ня заваяваць належнаго мейста сярот другіх значных мейстоу у гісторыі гэтай равалюцыі.

Трэба ня абмінуць напомніць, што хоць на капыльскую арганізацыю зменчан і меу уплыу досі значны сацыялдамакратызм, але яна доуга заставалася ня чыста сацыял-дамакрацкаю, а шмат мела у сабе прыхільнікау і да с-р. Гэтаму віною было, раз, традыцыя пераданая народавольнікамі, другі раз, сацыяльны склад сяброу арганізацыі, якія больш былі з гаспадарскіх сыноу, ня зусім бедных, ды із рабочых-падмайстрау, так сама ня зусім адчудзіушыхся зямлі. З гэтае прычыны кіраунікам арганізацыі прыходзілася дужа часта паднімаць пытаньня аб дыскусі (спрэцца). З Мінску, з Вільні і з другіх гарадоу прыяхджаушыя таварышы стараліся перацягнуць па свой бок капылян, гледзячы на тоя, былі яны с.-р., ці с.-д. З другога боку і у жыдоускіх грамадах траха ня нароунуй плоскаці стаялі і „Бунд" і сіяніцтва. Спрэчкі ж паміж інталігэнцыю, якую у нас складалі некулькі студэнтау, некулькі вучыцяліоу, правізары і інш., і рабочымі у сілу агульных законау клясовага размежаваньня, мелі мейста паміж капыльскіх таварышау, які усюды.

На „Біржу" часта заглядау і ураднік с патрулям, але толькі цырымонным маршам прайходзіу, чапаць жа баяуся.

Адным словам настаушая пара разбіла на трэскі усе пляны паліцы у Капылі, як усяго правіцяльства у Расеі. Той, на каго яны меліся апірацца-хістауся у бок ветру. Новая рота солдат, прысланых у Капыль на усмірэньня на узамен пенадзейнай, ня прынясла шкоды працы капыльскім сацыялісткім аргзнізацыям нізваньня, а шчэ наадварот—падспорыла яе, даушы з сябе шмат шчырых байцоу у рады равалюцыйнай арміі. Ведома, паліцыя была як пад зямлею ад гэтаго і вельмі кепска сябе чула: жарты! рота салдат—а жыць баязно, ня то ужо, каб руйнуваць і пішчыць „крамолу".

Прауда, адзін прыпадак яе крыху суцешыу, але сабою чуць ня пацягнуу вельмі благіх скуткау.

Дзела было вось як: адным дніом у мястэчку здарыуся пажар, на які, як і заусягды на гвалт збеглася крыху ня усе мэстэчка. Па звычаю на пажар прышоу і станавы, смелы, што у дзень, пры святле, ды ікрас ля салдацкіх казармау. Набраушыся зуху, еп, абходзючы пагарэльля, угледзяу некі ля сябе нелад і пачау лаяцца з сынам гаспадара згарэушае хаты, які і рабіу гэты па яго не лад. Слова за слова і вышла к таму, што „пачальства" замахнулася палкаю. Трэба было гэта, каб замецiушыя мешчаня кінуліся на станавога і хочучы крыху змяць яго, але еп дахітрыуся і хуччэй пабег да салдат, просючы іх уступіцца. Сярот салдат якісь знашоуся, што упадрад некулькі раз выстраліу. Гэта надта разлавала мешчан і яны грумадаю кінуліся у двор, дзе стаялі салдаты, патрабаючы выдаць станавога. Магло стацца дрэнным, але нашліся боляй мяккія і угаварылі пакінуць на гэты раз станавога. Паміж гуменьня, пад аховаю салдат, еп зайшоу да дому цэлым.

Вось гэты выстрал станавымъ выталкавауся у сваю карысць, з якоя прычыны—было яму аднаму ведома. Даляй спадобнаго і гэтаму ня здарылася. Трасці мешчан, якія упчалі траха ня аткрыта сеч панскі лес (пам. Вайніловіча), станавы адсылау ураднiка з салдатамі, сам жа баяуся іці; бо мусіць чуу пядобрая. Адным разам смелаго ураднiка мешчаня добра пабілі, а салдаты і пяуступіліся..

Так рабілася усмірэньня у Капылі равалюцыі с помаччу салдат праз сем месяцау. Ікрас перад агульнаю забастоукаю, пошля замірэньня, яны пакінулі Капыль, каб даць волю сацыялістычнаму руху свабодна шырыцца.

Стары С.-Д.

(Будзя даляй).

гистрировавшихся белоруссов беженцев на котегории для установления отправки их в I, II, III и т. д. очереди. В целях создания условий, способствующих в недалеком будущем, когда будет об'явлена общая рэвакуация беженцев официально, Ликвидационно Беженским Отделением Подотдела, в контакте с Регистрационным Отделением и с Комиссариатом по беженским делам вырабатываются рэвакуационныя планы; помимо того Ликвидационно-Беженским Отделением Подотдела ведутся работы по собиранию материалов об эвакуированных из Белоруссии в пределы Северной Области учреждений и установлений; этим же отделением Подотдела принимаются меры к установлению связей с означенными учреждениями и установлениями и им же принимаются меры ликвидации тех эвакуированных из края учреждений, которыя согласно установившемуся новому строю, являются отжившими свой век учреждениями.

(*Продолженіе слѣдуетъ*).

Песня красноармейца.

Вот вспыхнуло утро, и чехо-словаки,
Собравшись с гвардейцами белыми, ждут,
Что силы купцов, англичан и французов
На помощь из Мурмана скоро придут...

И вместе нагрянув, борцов за свободу
Разстреливать, вешать скорее начнут,
Банкирам, купцам обезпечат заводы
Помещикам земли скорей отдадут...

Но чу! Чей то голос призывный раздался:
Свобода в опасности, братья! Вставай!
К оружию смело за правое дело,
Землю и волю свою не отдай!...

Вот стройныя силы под флагом свободным
Рабочих-крестьян, тесно сомкнутых в ряд,
Под гул канонады пошли в наступленье—
Сердца их отвагой и местью горят...

Ждем кончится бой и враги беспощадно
Сметутся с дороги железной рукой.
Смело, товарищи, полны отваги
Вы принимайте решительный бой.

Коммунист Беларус.

Резолюція 1-я.

Собраніе Бѣлоруссовъ—Моряковъ Балтійскаго флота и гражданъ Бѣлоруссіи, урожепцевъ Гродненской, Виленской, Минской, Витебской, Могілевской и Смоленской губерніи и Бѣлорусскихъ уѣздовъ Сувалкской, Ковенской, Курляндской, Черниговской, Орловской и Псковской губ., состоявшееся 3-го Августа въ г. Кронштадтѣ, заслушавъ докладъ представителя Бѣлорусскаго Національнаго Комиссаріата т. Устиловича о дѣятельности Комиссаріата и о мѣрахъ, предпринимаемыхъ Комиссаріатомъ въ отношеніи найскорѣйшей рэвакуаціи бѣлоруссовъ—бѣженцевъ постановило: привѣтсвовать дѣятельность Б. Н. К. направленную на отстаиваніе интересовъ бѣженцевъ—бѣлоруссовъ. Собраніе требуетъ и на будущее время отъ своего Національнаго Бѣлорусскаго Комиссаріата столь же ревностной и столь же плодотворной работы в цѣляхъ защиты и охраны политическихъ и національныхъ интересовъ Бѣлорусскаго Трудового народа отъ всякихъ шовинистовъ и узконаціоналистовъ, преслѣдующихъ свои имперіалистическія цѣли и покушающихся на захватъ тѣхъ или другихъ частей территорій Бѣлоруссіи.

Собраніе также указываетъ и на настойчивую необходимость для Б. Н. К. озаботиться въ первую очередь рэвакуаціей бѣлоруссовъ—бѣженцевъ изъ голодающихъ губерній, въ которыхъ они съ самаго начала эвакуаціи были разселены, обезпеченіе послѣднихъ хотя бы минимумомъ необходимыхъ средствъ для существованія.

Подписали: Предсѣдаль **С. Костинъ.**
Секретарь **Ракитскій.**

Резолюція

Собранія Бѣлоруссовъ—Моряковъ Балтійскаго флота и гражданъ Бѣлоруссіи, урожепцев: Гродненской, Виленской, Минской, Могилевской, Витебской, Смоленской и Бѣлорусскихъ уѣздовъ Сувалкской, Ковенской, Курляндской, Черниговской, Орловской и Псковской губерній состоявшееся 5-го Августа 1918 года въ гор. Кронштадтѣ, заслушавъ докладъ Завѣдывающаго Бѣлорусскимъ Отдѣломъ т. Ковшилло о дѣятельности и задачахъ Отдѣла постановило довѣсти до свѣдѣнія Совѣта НародныхъКомиссаровъ Сѣверной Области и Центральной Совѣтской Власти, что то ненормальное положеніе, какое создалось въ бѣженскомъ вопросѣ далѣе не можетъ быть терпимо: необходимо принять самыя энергичныя и неотложныя мѣры къ урегулированію бѣженскаго вопроса; необходимо асигновать нужныя средства въ распоряженіе Національнаго Бѣларусскаго Комиссаріата, Бѣларусскаго Отдѣла Союзъ Коммунъ Сѣверной Области, Витебскаго и Смоленскаго отдѣленій Н. Б. К., дабы эти наши Ноціональныя Учрежденія могли бы широко организовать дѣло помощи бѣлоруссимъ—бѣженцамъ. Собраніе обращаетъ вниманіе Совѣта Народныхъ Комиссаровъ Сѣверной Области и Центральной Совѣтской Власти также и на то совершенно недопустимое явленіе, клонящееся къ подрыву Совѣтской Власти со стороны тѣхъ учрежденій и лицъ, которыя, прикрываясь ярлыкомъ коммунизма, дѣйствуютъ во вредъ и подрывъ Совѣтской Власти, проявляя безумный и форменный саботажъ въ отношеніи всѣхъ тѣхъ начинаній, которыя стремятся осуществить наши учрежденія Національности, стоящія на Совѣтской платформѣ.

Собраніе считаетъ своимъ долгомъ поручить специальной делегаціи, выбранной изъ среды Бѣлоруссовъ—Моряковъ Балтійцевъ, отправиться въ трудовую Коммуну и въ Центральный Совѣтъ Народныхъ Комиссаровъ, чтобы доложить непосредственно о всѣхъ нуждахъ бѣлорусскаго трудового народа и въ частности и о тѣхъ препятствіяхъ, какія ставятся со стороны отдѣльныхъ лицъ и учрежденій нашимъ Національнымъ учрежденіямъ, выдвинутымъ нами и созданнымъ Центральной Совѣтской Властью.

Подписали: Предсѣдатель **Костинъ.**
Секретарь **Ракитскій.**

Аб усім па троху.

З Беларусі.

У Вітабшчыня збіраньня жыта ідзе к канцу. Пачынаюць малаціць. Ураджай вышэй сярэдняго. Стараюцца павялічыць новаго засеву.

Са стан. Ворша едучыя даносюць, што там сабралася каля 15 тыс. варочаюпічым у забраныя землі. Згодна цялеграмы вакругі далейшая перэдача бежанцау можа адбыцца толькі у тым прыпадку, калі гэрманскія уласці стануць даужны 200 вагонау. Паміж тым у цяперашні час доуг вагонамі ровян ужо 800 і калі бежанцы барджэй ня будуць адпрауляны, та імі запоуніцца і Ворша і Смаленск. Яны вельмі моспа цярпяць усякую бяду і пападаюць у лапы нядобрых людзей, якія нажываюцца праз іх бяду. За перапіханьня і перадачу вагона назначана ад 8 да 10 руб., „з галавы". Начальнікі ст. Ворша, каб абмінуць далейшыя пялады з адпраукаю бежанцау прапануюць з свайго боку, покуль што абменьвацца з гэрманцамі вагон па вагон.

Мінскім Сакратар'ятам выдаецца шмат беларускіх кніжак. Выдана паміж іншым граматыка Тарашкевіча.

У Мінску выдаецца новы беларускі журнал „Варта", дзе друкуяцца на польску, украінску, расейску і беларуску. Радактарам яго Я. Варонка.

Пад кірауніцтвам Я. Варонкі асобная каміс'я разпрацоувая закон аб выбарах у беларускі Устаноуны Сойм.

У многіх мейстах Беларусі істнуюць паветавыя і местачковыя беларускія рады.

З-заграніцы.

Брытанская сацыялістычная работнічая партыя (у Англі) абвясціла вось які маніхвэст:

„Баранеця равалюцыю. Мы хочам звярнуць увагу усіх сацыялістскіх грамад, якія спагадаюць Радаваму Правіцяльству Расеі і якія прагуцца да абароны усусьветнай равалюцы у яе цяшкім палажэньню, звязаным з тымі варункамі, у якія пастауляны нашы расейскія таварышы. На Украіня і у Фінляндзі усе супроць равалюцыйныя правіцяльствы дасталі прызнаньня французскіх уласціоу. Сацыялісткі рух знарок быу задушан с помаччу нямецкага войску. Кіраунік кадэтау Мілюкоу, як павядамляюць газэты, выяхау у Бэрлін. Чэхаславакі выказалі намер „сцерці" сацыялізацыю (агульна-народная карыстання дабром) і нацыялізаацыю (агульна-гасударская уладаньня) гандлёва-прамысловых прадпрыемнасцяу і, такім чынам, узбудаваць правы часнае уласнасці. Па апошнім весткам, ідучым з правіцяльствяных колау, відаць, што хаурусьнікі ня могуць панадзеяцца на супроць-равалюцанэрау, ці то будуць грашаунікі ці мерныя сацыялісты, бо забаронай апошніх з'яуляяцца ці забарона часнае собсцвяннасці, ці забарона хвормау управы, якія ня адказваюць мэця і нявыказваюць волі работнічаго стану.

Кожны чалавек, колькі-небудь знаемы з вайсковым дзелам, пракапаяцца, што мэта адновы расейскаго фронту праз Фінляндзію пераз одну чугунку некемна і з'яуляяцца простаю прычэнкаю, якая закрывая сапраудныя намеры „аднавіць" парадак у Пецярбурзі і Маскве, а гэта, як добра ведома супроць равалюцанэрау, ня можа быць дасягнута імі бяз помачы іназемных штыхоу.

Пагроза замешаньня у расейскія справы па запрашэньню някаторых грамадзян Вобласнай Мурманскай Рады першая адчыніла вочы паміжнароднуй супроць-равалюцыі. Гэта абвяшчэньня вайны амерыканскімі, ангельскімі і францускімі грашаунікамі бальшавіком за тоя, што яны асмеліліся адказаць ат даугоу, зробленых царом, назначаных дзеля задушэньня равалюцыйнаго руху у 1905 году у Расеі.

Але гэта яшчэ ня усе. Гэта обвяшчэньня вайны бальшавіком, якія посяць штандар паміжнароднай сацыялісткай равалюцыі, дае змогу грашаунікам усіх краіоу запіраць у вастрогі і ганяць тых, каго спадобны да ягамосця Норкліфа супроць-равалюцанэры будуць разглядаць, як бальшавікоу, як сяброу сацыялісткай партыі, якая ня трымая хаурусу з уласцю і якія аткрыта ці закрыта спагадаюць бальшавіком.

Гэтак рабілася і гетак будзя рабіцца дзеля „спасеньня дамакраты".

У адносінах да гэтаго трэба помніць, што маюцца дзьве дамакратыі, зусім адна да другоя супроцьныя. Адно, гэта—правы кожнаго чалавека на уласнасць, а другоя—правы усіх людзей на усе. Першымі з'яуляюцца французскія і амерыканскія дамакраты, чужыя да чыстаго разуменьня сацыялізмы, што робяць прыхільнікау гэтых мэт нязмірымымі варагамі. Гэтым з'ясняюцца адносіны хаурусных гасударствау да бальшавікоу і за сім ікрас ясна, што чакая нашых таварышау, калі мы ня выпаунім усіх мерау, якія маюцца у нашым распараджэньню дзеля таго, каб давясці да павядамленьня выпауніцяляу волі грашаунікоу, што работнічы стан нашае староны ня сцярпіць ніякіх дзеяу, якія вядуць да падаву парыжаскае камунны 1871 г. і расейскае равалюцыі 1905 г. Прыпомніця, таварышы, сцену фэдэралістау 1797 году і тысячы сталыпінскіх вешалак. Помніця, таварышы, што „мерныя" спадоб'я Керэнскаго будуць змецяны супроць-равалюцыяй, як мухі, як гэта было у 1798 г. Здарэньня штырхаюць гэтых „ідэялістау" прымаць далуку у карах (рэпрэссях), аб якіх яны і ня думаюць.

Таварышы, гэта самы сур'езны момант у гістор'і паміжнародніч'я. Ат нас залежыць спасеньня равалюцыі і разам с тым спасеньня нас самых.

Да працы!"

Фінляндскі сэнат выдау пастанову, якою робяцца аткрытымі так празываныя жандармскія корпусы падчынятыя ваеннаму міністру. Мэта гэтых корпусау абараняць край і падтрымоуваць парадак.

З-Украіні.

На Украіня восяньню адбудуцца прызвы навабранцау 18, 19 і 20 гадоу. У войска возьмуць глауным чынам селян, якія маюць ня меняй ніш 50 дзесяцін зямлі.

Немцамі арыштована каля 6000 тыс. чалавек работнікау на чугунках, якія за забастоуку будуць пасланы у Гэрманю на прымусовыя работы.

Як падлічыла міністэрства дарог, дык двухтыдніовая забастоука на чыгунках абышлася у 27 мільенау стратку—ікрас той лік грошы, які патрэбян на авыплату за марц і апрэль месяцы жалаваньня служачым.

Выдан прыказ у Кіявя, якім веляна кінаматограф зрабіць украінскім. Усе надпісы на карцінах павінны быць зробляны на украінскуй мовя.

У Новачаркаску адчыняяцца Устаноуны збор данскіх казакоу.

З-Расеі.

Як павядамляюць Самарскія газэты, усе ахраннікі і жандары царскаго парадку у занятых чэха-славакамі мейстох, дасталі старыя цравы. Чым вышэй „ахраннік" меу чын, тым даходняйшая іоп цяперака дастае мейста.

У Біручы пануя пошасць гішпанскае хваробы. Кожны дзень захворвая па 70 чалавек. Дзесяць % умірая.

Кулакі (багатыя селяня) у Валагодкуй губэрні хаваюць збожа, закопваючы у зямлю на 200-300 лукоу. Сялянская беднота закопаная знайходзіць і у пару адбірая дарэмна.

Каля Асташкаускіх (Тверской губэрні) так празываных Самарскіх балот, разрабляючы торфу, знашлі нафту.

Вядуцца падгатоуныя работы.

Праз Волагду павядамляюць, што выходзячая у Архангяльску газэта „Возрожденіе Сѣвера" дужа шкадуя, што рабочыя ворожна адносяцца да новае уласці. Рада прахвессыянальных хаурусау адхіліла разалюцыю згоднікау і абвясціла, што будзя цверда стаяць за інтарэсы клясовыя.

Пошля таго, як дабравольная армія захапіла г. Новачаркаск туды з усіх бакоу сталі злятацца чорныя вароны-рожныя „чорныя дзеячы": старшыня гасударскае думы Радзянка, жонка гэн. Карнілава, радактар газэты „Кіяулянін" Шульгін і інш.

У вобласці войска данскога ідзе прадажа гарэлкі. Кожны дзень ад прадажы дастаецца 200.000 руб. Вельмі шмат гарэлкі прадаецца у г. Растовя.

„Кацярынаслауская Слова" павядамляя, што папярэднія атрады японскаго войску злучыліся з чэха-славакамі і уже спатыкаліся з бальшав. войскам.

На Доня вярнуушыя пад апеку гэн. Краснова памешчыкі шчыра прыняліся здаваць селянам зямлю у арэнду па дужа вычокуй цане.

У Пецярбурзі усім прыязджаючым туды пошля 20 аугуста камісар'ят Здавольства выдае асобныя двухдніовыя цэтлікі на абеды у гарацкіх грамадзянскіх сталовых. Хто пакажа гэты цэтлік, таму належыць бязспэчна даваць абедаць. Гэтыцэтлікі заменьваюць карткі на яду.

Радактуя і выдае Друкарскі Атдзел Беларускаго Нацыянальнаго Камісарыяту.

Типографія Сов. Раб. Деп. Москва, Тверская, Мамоновскій пер., д. 12.